ПАДЗЕЯ

# «Ангел-хранитель» Вікторыі Смолкі

**23 мая супрацоўнікі Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаёнка запрасілі сваіх чытачоў на прэзентацыю новай кнігі "Ангел-хранитель" Вікторыі Смолкі, маладой Гродзенскай паэтэсы і самага маладога члена абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.**




Аўтар – узнёслая, адухоўленая асоба, захопленая прыгажосцю мастацкага паэтычнага слова. Крыніца натхнення для Вікторыі Смолкі – дабрыня, чысціня і спагада, вера і надзея, каханне і мудрасць, родныя, сябры і проста людзі, праца і перамога, музыка і мастацтва, а таксама сустрэчы з паэтычнай заступніцай Дзіянай Гурцкая на міжнародным фестывалі «Белая трость» (Масква).

Паэтка не толькі прэзентавала новую кнігу, але і распавяла аб сваім першым зборніку пад назвай "Зоркаму сэрцу", чытала свае творы і каментавала гісторыі іх стварэння. Слухачоў уразіла шчырасць Вікторыі. Старшыня абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла Кебіч і паэт Дзмітрый Радзівончык падзяліліся сваімі ўражаннямі ад новай кнігі, падарылі маладой паэтцы свае ўласныя паэтычныя радкі. Чытачы бібліятэкі, навучэнцы політэхнічнага каледжа не маглі стрымаць слоў захаплення і падзякі ад судакранання з паэтычнай творчасцю Вікторыі Смолкі.

КРЫНІЦА

**На фота:** маладая гродзенская паэтэса Вікторыя Смолка і моманты прэзентацыі яе новага зборніка лірыкі «Ангел-хранитель». Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А.Макаёнка, 23 мая 2019 года.


Маладосць
КАЛОЖСКІ ДАБРАВЕСТ


Каралеўскі горад над Нёманам
Да 75-годдзя Гродзенскай вобласці
ГРОДНА
ЗЯМЛЯ
БІБЛІЯ
Маладосць
КАЛОЖСКІ ДАБРАВЕСТ


ГРОДНА
Маладосць
КАЛОЖСКІ ДАБРАВЕСТ